# ДРАЎЛЯНАЯ АРХІТЭКТУРНАЯ РАЗЬБА СЯДЗІБНАГА ДОМА ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ

Я.Р. Малікаў
*БДУТ, г.Гомель*

Забудова беларускіх вёсак у сёняшні час вядзецца сядзібнымі дамамі. Іх архітэктурнае рашэнне набывае вырашальную ролю ў стварэнні прывабнага вобліка населенага пункта ў цэлым. Выкарыстанне драўляных элементаў з дэкаратыўнай разьбой на фасадах сядзібных дамоў мае старажытную тра-дыцыю. У дадзеным артыкуле аўтарам асветлены вытокі ўзнікнення і развіцця традыцыі драўлянай дэкаратыўнай разьбы на тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Беларусі.

Тэма драўлянай дамавой разьбы паўднёва-ўсходняй Беларусі з'яўляецца адной з малавывучаных старонак гісторыі народнай архітэктуры Беларусі. Як правіла даследчыкі адзначаюць наяўнасць на Гомельшчыне "яркага, насычанага разьбянога дэкору", а таксама "багацце міфалагічнага і сімвалічнага зместу сюжэтаў народнай архітэктурнай разьбы"[1]. Але ніводнай працы, прысвечанай уласна беларускай архітэктурнай разьбе, яе структуры, паходжанню і сімволіцы ў рэспубліцы апублікавана не было. Пры гэтым тэма беларускай народнай драўлянай архітэктурнай разьбы настолькі глабальная і ўсеабдымная, што, акрамя ўласна архітэктуры, закранае галіны мастацтвазнаўства, міфалогіі, археалогіі, псіхалогіі, міжэтнічных і міжкультурных уплываў, асноваў этнічнага менталітэту. Толькі такі, шырокі міждысцыплінарны падыход, дазволіць аб'ектыўна вывучыць сутнасць, паходжанне і ўплыў народнага архітэктурнага дэкора і ягонай сімволікі на жыццё старажытных і сучасных людзей. А таксама вызначыць ягонае месца на сёняшнім этапе развіцця беларускай архітэктуры.

### Традыцыі архітэктурнай разьбы ў паўднёвай і ўсходняй Беларусі

Даследчыкі беларускай народнай архітэктуры адзінадушна адзначаюць, што драўляны разьбяны дэкор распаўсюджаны на ўсходзе і поўдні Беларусі. У гэты ж час далей на захад памеры і колькасць дамавой разьбы змяншаюцца, больш характэрным становіцца аздабленне дамоў пластычнай апрацоўкай канструкцый, шаляваннем і рознакаляровай афарбоўкай[2]. Усе даследчыкі пагаджаюцца, што паўднёва-усходняя Беларусь – рэгіён распаўсюджання найбольш яркага, насычанага разьбянога дэкора.

Паўднёва-усходняя традыцыя дамавой разьбы вызначаецца шырокім распаўсюджаннем прапільных карункаў, і ў асноўным ахоплівае тэрыторыю Гомельскага, Добрушскага, Чачэрскага і Веткаўскага раёнаў, на поўдні пераходзячы мяжу паўночнай Чарнігаўшчыны (Дабранка), на усходзе – мяжу з паўднёва-заходняй Браншчынай (Злынка, Клінцы, Навазыбкаў), на захадзе дасягаючы Рэчыцы, на поўначы – Жлобіна (пры гэтым пераважная частка дамавой разьбы г.Жлобіна адносіцца да іншай, асіповіцка-бабруйскай традыцыі).

Акрамя паўднёва-усходняй, на Беларусі выдзяляюцца яшчэ некалькі рэгіянальных традыцый дэкаратыўнай дамавой разьбы. Палеская – характарызуецца наяўнасцю вялікіх салярных сімвалаў на франтоне і ахоплівае арэал прыблізна ў межах Жыткавіцкага, Столінскага і Лунінецкага раёнаў. Асіповіцка-бабруйская – вызначаецца шырокім распаўсюджаннем ліштваў, аздобленых дэкорам на аснове геаметрычных кампазіцый барочнага і класіцыстычнага характара, ахоплівае тэрыторыю Бабруйскага, Асіповіцкага раёнаў, даходзячы на паўднёвым захадзе – да Акцябрскага раёна, на поўдні – да Жлобіна.

### Паходжанне традыцыі і яе сувязі з займаемай тэрыторыяй

Першае пытанне, якое турбуе даследчыкаў народнай архітэктуры Беларусі – прычыны ўзнікнення і распаўсюджання традыцыі драўлянай архітэктурнай разьбы толькі на поўдні і ўсходзе Беларусі, і чым абумоўлены яе найбольшы росквіт менавіта ў паўднёва-усходніх раёнах Гомельшчыны.

Значная колькасць даследчыкаў[3], такую "прывязанасць" дэкаратыўнай дамавой разьбы тлумачыць блізасцю да Расіі, традыцыі дамавой разьбы якой дабра

---

[1] Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. - Мн. 1995, с. 280, 259.

[2] Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. - Мн. 1995, с. 276.

[3] Беларуская народная арітэктурная разьба. - Альбом. Мн., 1958; Локотко А.И. Белорусское народное зодчество. - Мн. 1991; Трацевский В.В. История архитектуры народного жилища Белоруссии. Мн., 1985 і інш.

асветлены ў навуковай літаратуры[4]. Але чамусці ніхто з даследчыкаў не звяртаў увагі, што на памежжы з Беларуссю традыцыя драўлянай дамавой разьбы характэрна толькі для некалькіх раёнаў паўднёва-заходняй Браншчыны – у першую чаргу Навазыбкаўскага, Злынкаўскага, Клінцоўскага[5], а таксама для Рэпкінскага, Гараднянскага, Чарнігаўскага і суседніх раёнаў паўночнай Чарнігаўшчыны. Такім чынам, адзначаная тэрыторыя сумежжа трох краін утварае свой лакальны арэал, народны дэкор якога вызначаецца шырокім ужываннем прапільной разьбы. У гэты ж час узнікненне асаблівасцяў у развіцці архітэктуры і мастацтва паўднёва-заходніх раёнаў Браншчыны расійскія даследчыкі непасрэдна звязваюць з іх увахоаджаннем у XVII стагоддзі ў склад Рэчы Паспалітай[6].

Такая акалічнасць тлумачыцца тым, што менавіта ў 1-ай палове XVII ст. (калі ўзгаданыя тэрыторыі ўваходзілі ў склад ВКЛ – усходняй часткі Рэчы Паспалітай) з Заходняй Еўропы праз Польшчу і Кёнігсберг у Вялікае княства прыходзіць традыцыя аб'ёмнай разьбы і іншыя дасягненні барочнага мастацтва. Праваслаўнае насельніцтва ўсходу ВКЛ, праз безпасрэднае суседства з каталікамі і высокі ўзровень уключанасці ў агульнаеўрапейскія эканамічныя і культурныя сувязі, талерантна ставілася да новых барочных уплываў і ахвотна іх пераймала, у тым ліку і аб'ёмную разьбу. На гэта ўказваюць шматлікія факты, напрыклад будаўніцтва ў Магілёве ў 1669-72 гг. барочнай праваслаўнай Мікалаеўскай царквы, інтэр'ер якой аздоблены цудоўным іканастасам, выкананым у тэхніцы аб'ёмнай барочнай разьбы. У гэты ж час на тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы духавенства і ўлады былі значна больш кансерватыўнымі і разнастайнымі спосабамі імкнуліся не дапусціць "лацінства" – заходнееўрапейскага культурнага ўплыву на жыхароў сваёй дзяржавы. У 1654 годзе да Маскоўскай Русі (разам з Левабярэжнай Украінай) адыйшлі ўсходнія тэрыторыі адзначанага рэгіёну, уключна з гарадамі Старадубам, Мглінам, Почапам і інш. У 2-ой палове-канцы XVII ст. барочныя традыцыі шырока распаўсюджваюцца па Маскоўскай дзяржаве праз шматлікую эміграцыю майстроў-рамеснікаў з Беларусі (дзе дабраахвотную, а дзе і прымусовую), а таксама з Украіны. Але тэрыторыі вывучаемага намі рэгіёна, яшчэ будучы ў складзе ВКЛ-Рэчы Паспалітай, ужо зведалі ранні барочны культурны ўплыў і таму захавалі яго на шмат глыбей у адметнасцях сваёй мясцовай культуры, будучы ўжо ў складзе іншай дзяржавы.

Канешне, нельга ўвогуле адмаўляць саму магчымасць культурнага ўплыву архітэктурных традыцый Расіі на беларускіх майстроў. Але наяўнасць на Беларусі некалькіх вялікіх рэгіянальных традыцый архітэктурнага дэкору, строга акрэсленых тэрытарыяльна і моцна адрозных паміж сабой канструктыўна, сведчыць аб іх спрадвечнасці (аўтахтоннасці) для займаемых тэрыторый.

З іншага боку, праведзеныя намі палявыя даследванні 1995-2005 гг. сведчаць, што лакальная традыцыя прапільной дамавой разьбы ў значнай меры супадае з межамі Гомельскай губерні 1924-26-х гг. (напярэдадні далучэння заходніх раёнаў – Гомельскага і Рэчыцкага у склад Савецкай Беларусі, у той час як усходнія – Навазыбкаўскі, Старадубскі і Клінцоўскі, засталіся ў складзе РСФСР).

---

[4] Колчин Б. А. Новгородские древности. Резное дерево. - М. 1971; Круглова О. Русская народная резьба и роспись по дереву. - М.1983; Рождественская С.Б. Русская народная традиция в современном обществе: архитектурный декор и художественные промыслы. М.1981; Рыбаков Б.А. Язычество древних славян. - М.1981; Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. - М. 1988; Скворцов А.И. Русская народная пропильная резьба. - Л.1984 і інш.

[5] Свод памятников архитектуры и монументального искусства России. Брянская область. - М., 1998, с. 57.

[6] Свод памятников архитектуры и монументального искусства России. Брянская область. - М., 1998, с. 11.

Болей за тое, калі Гомельская губернія 1924-26 гг. з'яўляецца досыць штучным адміністратыўным утварэннем, якое мала ўлічвала этнаграфічныя межы, дык з упэўненасцю можна сцвярджаць, што аднaзначныя межы тэрыторыі паўднёва-усходняй традыцыі драўлянай дамавой разьбы амаль цалкам супадаюць з межамі Гомельскага рэгіянальнага рынка 2-ой паловы XIX-пач. XX ст. (які ў сваю чаргу ахопліваў і тэрыторыі паўночнай Чарнігаўшчыны, а таксама сучасных Брагінскага, Хойніцкага, Калінкавіцкага, Жлобінскага і інш. раёнаў). Пачатак фарміравання ж гэтага рэгіянальнага рынка ўзыходзіць яшчэ да часоў сярэднявечча, калі Гомель быў цэнтрам аднайменнага староства і разам з Чачэрскам – найбуйнейшым горадам Посожжа і левабярэжнага Падняпроўя. Падкрэсліваем – лічым не выпадковым значнае супадзенне тэрыторый, займаемых традыцыяй прапільной дамавой разьбы (паўднёва-усходняй традыцыі драўлянай дамавой разьбы), і Гомельскага рэгіянальнага рынка 2-ой паловы XIX-пач. XX ст.

Уважлівы аналіз сведчыць, што тэрыторыі, займаемыя рэгіянальнымі традыцыямі дамавой разьбы (прынамсі паўднёва-усходняй і палескай), у значнай меры супадаюць з тэрыторыямі, што займалі летапісныя плямёны радзімічаў і дрыгавічоў, хоць дакладнага супадзення межаў і няма. Падобнае супадзенне адносна геаграфічнага размежавання сюжэтаў дамавой разьбы Іванаўскай, Уладзімірскай абласцей і Яраслаўскага Паволжа (Расія) прасочвае Б.Рыбакоў, досыць аргументавана суадносячы гэтыя адрозненні са спадчынай наўгародскіх славен і фінаўграў меры[7].

Але трэба прызнаць: 1000-800 гадоў – занадта вялікі адрэзак часу, на працягу якога сваё ўздзеянне маглі аказаць не толькі этнічныя, але і шматлікія іншыя, у тым ліку мастацка-стылёвыя ўплывы. У дадатак варта адзначыць, што межы асіповіцка-бабруйскай традыцыі дамавой разьбы адназначна не супадаюць з межамі хоць нейкага "племяннога" утварэння адпаведнага часу, і на яе ўзнікненне відаць паўплывалі нейкія іншыя чыннікі.

Сыходзячы з гэтага, дакладна можна сцвярджаць што на на сёння ў беларускай этнаграфіі сабрана яшчэ занадта мала факталагічных матэрыялаў, якія маглі б хоць неяк праясніць версію аб паходжанні лакальных традыцый драўлянай архітэктурнай разьбы 2- ой паловы XIX-XX ст. ад асаблівасцяў матэрыяльнай і духоўнай культуры тых ці іншых летапісных плямён VIII-XII ст. Але ў любым выпадку цалкам адмаўляцца ад такога "племяннога" аспекта вывучэння праблемы паходжання лакальных асаблівасцяў дамавой разьбы яшчэ рана.

**Паходжанне ўласна самой з'явы народнай драўлянай дамавой разьбы, у тым ліку і на ўсходзе Беларусі**

Старажытныя драўляныя архітэктурныя разьбяныя дэталі, знойдзенныя на тэрыторыі ўсходняй Еўропы адносяцца да часоў Кіеўскай Русі. XI ст. дацiруецца кавалак разьбяной ліштвы з Полацка[8], да 1055-1422 гг. адносіцца вялікая колькасьць закрылін гарадскіх дамоў старажытнага Ноўгарада[9]. Аб існаванні драўлянага разьбянога дэкору на дамах XVII ст. можна меркаваць па зместу тагачасных інвентароў, якія апісваюць разьбяныя дзверы, ліштвы і аканіцы, шляхецкіх маёнткаў[10]. Самы вядомы будынак XVII ст., аздоблены драўлянай архітэктурнай разьбой – гэта палац расійскага цара Аляксея Міхайлавіча ў Каломенскім, пад Масквой. Палац быў аздоблены цудоўнымі барочнымі ліштвамі вокнаў, а таксама разьбянымі галерэямі, ганкамі, брамамі

[7] Рыбаков Б.А. Язычество древней Руси. - М., 1988. С. 486-491.

[8] Сахута Я.М. Ліштва // Этнаграфія Беларусі. - Мн., 1989. С. 293. Нажаль, малюнак гэтага фрагмента не прыведзены.

[9] Колчин Б.А. Новгородские древности. Резное дерево. - М., 1971. С. 32-33.

[10] Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVIIв. - Мн., 1991 С. 32. 142, 144, 130.

і іншымі аздобамі, якія цэлую зіму 1667/68 гг. выразалі беларускія майстры Клім Міхайлаў са Шклова і "старац" Арсеній з Воршы "со товарищи" Сучаснікі называлі гэты палац "восьмым цудам свету"[11].

З іншага боку, адкрытым застаецца пытанне наколькі можна казаць пра старажытнасць дамавой разьбы менавіта паўднёва-усходняй Беларусі, бо драўляных будынкаў аздобленых архітэктурным дэкорам, ранейшых за сярэдзіну XIX ст. не захавалася. У гэты ж час прапільная разьба даследчыкамі лічыцца адносна позняй, звязанай з вынаходніцтвам у 2-ой пал. XIX ст. стужачнай пілы (прынята лічыць, што на ранніх этапах у дамавым дэкоры пераважалі плоская і рэльефная (глухая) разьба, якую можна было зрабіць пры дапамозе нажа, сякеры, скрабка)[12].

## Народнае (сялянскае) паходжанне традыцыі дамавой разьбы

У асяродку даследчыкаў народнага побыту ўжо даўно склалася меркаванне, што па свайму паходжанню драўляная дамавая разьба з'яўляецца сялянскай, і ўжо потым, з вёскі, праз сельскіх майстроў-плотнікаў, яна патрапіла ў гарады і мястэчкі. У свой час такі погляд цалкам адпавядаў "пралетарска-сялянскаму" падыходу да вывучэння драўлянага дойлідства, паводле якога навукоўцы вывучалі выключна сельскую архітэктуру, як адлюстраванне адзіных сапраўдных народных каранёў. Гэта дазволіла глыбока даследваць сельскае будаўніцтва, але з іншага боку, пакінула па-за ўвагай не менш цікавае местачковае і гарадское драўлянае сядзібнае дойлідства.

Своеасаблівасць народнай архітэктурнай разьбы на Беларусі заключаецца ў тым, што па свайму паходжанню яна з'яўляецца местачковай, а не вясковай (мястэчкі – населеныя пункты, што адрозніваліся ад вёскі наяўнасцю гандлю і рамяства як сталых заняткаў значнай часткі жыхароў, а ад горада – меншымі памерамі і аграрнымі заняткамі асноўнай часткі насельніцтва). Шматлікія гістарычныя матэрыялы падаюць, што ў XVII-XVIII ст. архітэктурнай разьбой аздабляліся жылыя будынкі заможных слаёў насельніцтва – мяшчан і шляхты. Этнаграфічныя матэрыялы другой паловы XIX – пачатку XX ст. сведчаць, што найбольш яркі разьбяны дэкор з дасканала распрацаванай сістэмай элементаў, сустракаецца ў сядзібным дойлідстве мястэчак і гарадоў, у той час як адначасовыя з імі матэрыялы сельскага разьбянога дэкору, хоць і маюць аднолькавыя з местачковымі матывы разьбы, але з'яўляюцца больш сціплымі (у асноўным аздоблены толькі вокны). Прычына гэтага верагодна хаваецца ў больш заможным узроўні жыцця мяшчан і шляхты. І з гэтым нельга не пагадзіцца, бо цяжка ўявіць разьбяную ліштву на валакавым вакне курной сялянскай хаты XVII–XVIII ст., у той час як у гарадах гэтага часу актыўна прымянялі шкляныя вокны, якія зачыняліся драўлянымі аканіцамі.

Але таксама нельга не прызнаць таго факта, што матывы і семантыка разьбянога дамавога дэкору знаходзяць найбольш адпаведнасцяў менавіта ў матэрыялах вясковага фальклора і ткацтва. Справа тут відаць у тым, што ў майстры, выразаючы драўляную аздобу дамоў, адлюстроўвалі ў ёй тую дэкаратыўную і светапоглядную сістэму, якая была здаўна характэрна для дадзенай мясцовасці і ўспрынялася імі яшчэ ў дзяцінстве, на ўзроўні архетыпаў. Па сваёй сутнасці гэта традыцыйны светапогляд (менталітэт), з уласцівымі толькі яму матывамі, міфалагічнымі сімваламі, персанажамі і сродкамі выяўлення. Гэты светапогляд перадаецца з пакалення ў пакаленне праз традыцыйныя побыт, святы, абрады, фальклор, працоўныя навыкі, архітэктурныя збудаванні і

---

[11] Сахута Я.М. Народная разьба па дрэву. - Мн. 1978, с. 5.

[12] Родной дом. Культура резного украшения современного дома в Гомельской области. - Гомель. 1999. с. 5.

інш. У XX стагоддзі горад, як месца скрыжавання, канцэнтрацыі і насаджэння разнастайных навейшых ідэяў, найменш захаваў той традыцыйны народны светапогляд, уласцівы асноўнай масе насельніцтва яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. У гэты ж час больш кансерватыўная вёска, з яе традыцыйным сялянскім укладам жыцця, які амаль не мяняўся на працягу стагоддзяў, здолела захаваць традыцыйны светапогляд нават да другой паловы XX ст. Таму ў значнай меры менавіта вясковыя фальклор і ткацтва з'яўляюцца "ключыкам" для разумення сэнса драўлянай архітэктурнай разьбы.

**Сучаснае становішча дамавой разьбы ў сядзібным будаўніцтве паўднёва-усходняй Беларусі**

Пасля вайны, у 1950-80-я гг., у дэкаратыўнай дамавой разьбе адбыліся значныя змены. З вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што перадаваемая майстрамі старая традыцыя ў значнай меры перарвалася. Прыклады дамоў з разьбою засталіся, але сэнсавае напаўненне разьбы згубілася. Пасляваенныя майстры, у асноўным працягваючы папярэднюю традыцыю, паступова губляюць пачуццё меры і рытма, якія так адрознівалі ўсю даваенную разьбу. Дэкаратыўнае ўбранства пераносіцца ў асноўным на ліштву, і гэта амаль адзіная сфера, дзе дэкор развіваецца. Шырока выкарыстоўваецца шалёўка і рознакаляровая афарбоўка, разьба часта размяшчаецца ў нехарактэрных для яе месцах. У гэты час назіраецца дзве асноўныя тэндэнцыі, якія ў асобных выпадках могуць аб'ядноўвацца, нават на адным доме.

Першая – у галоўных рысах працягваецца старая даваенная традыцыя з выкарыстаннем тых жа матываў, аднак з дэфармацыяй маштабнасці разьбы і яе асобных элементаў у суадносінах да ўсяго дома. Лініі дэталяў становяцца больш тонкімі, плаўнымі і строга сіметрычнымі, што надало дэкору некаторую штучнасць, халоднасць і адчужанасць ад наваколля. Акцэнт робіцца на сюжэты – яны значна ўскладняюцца і здрабняюцца, выявы дасканала прапрацоўваюцца, з'яўляюцца новыя матывы (пяцікансовыя зоркі, самалёты і т.п.). Назіраецца відавочная масавая перавага двух-трох сюжэтаў (шаблонаў) на ўвесь населены пункт.

Другая тэндэнцыя – у дамавой разьбе адбываецца паступовая дыферэнцыяцыя сюжэтаў і іх спрашчэнне да нейкага абсурднага набора геаметрычных матываў і знакаў, якія не нясуць нейкай канкрэтнай ідэі, а проста запаўняюць свабодныя месцы. Часта такая разьба характарызуецца наспех зробленым неякасным выкананнем і абсалютнай нечытэльнасцю сюжэтаў. Навідавоку паступовая нівеліроўка і выраджэнне дэкора, падмена глыбокіх ідэяў, якія першапачаткова ён нёс, знешняй прывабнасцю. Назіраецца з'ява "дэкор дзеля дэкору". З'яўляюцца дэталі і сюжэты, узятыя з масавых цэнтральных часопісаў, нехарактэрныя для мясцовай традыцыі. Можна сцвярджаць, што гэта ўжо не развіццё традыцыі, а яе дэкаданс. Складваецца ўраджанне, што творчы патэнцыял майстроў так незапатрабаваны грамадствам, што яны, каб хоць неяк самарэалізавацца, укладваюць сваю энэргію ў кожны сантыметр апрацоўваемай дошкі, не адчуваючы меры і не ведаючы мясцовых традыцый. Відаць такі падыход павялічвае каштоўнасць зробленай працы ў вачах саміх выканаўцаў, але пазбаўляе цэльнасці ўспрымання ўсяго дома.

З 1990-х гадоў драўляная архітэктура, а разам з ёй і дамавы разьбяны дэкор, хуткімі тэмпамі выцясняюцца цагляным будаўніцтвам і рознымі навамоднымі пластыкавымі матэрыяламі. Гэта нясе вялізную пагрозу далейшаму існаванню вызначальнай рысы архітэктуры сядзібнага дома ўсходняй Беларусі – унікальнай старажытнай традыцыі драўлянага дамавога дэкору.

На наш погляд, сітуацыю можа змяніць прыняцце наступных мераў:

- Глыбокае і рознабаковае вывучэнне традыцый дамавой разьбы на тэрыторыі Беларусі і суседніх памежных тэрыторыях;

- Захаванне ў натуральным асяродку найбольш унікальных дамоў з прыкладамі драўлянай архітэктурнай разьбы і стварэнне на іх аснове разнастайных турыстычных аб'ектаў і маршрутаў (скансэнаў і т.п.);
- Шырокае вывучэнне і ўкараненне ў будаўнічую практыку традыцый беларускай дамавой разьбы (з захаваннем рэгіянальных асаблівасцяў) на разнастайных архітэктурных і мастацкіх аддзяленнях навучальных установаў Беларусі.